Падтрымай "Вясну" на PATREON

# Свята Першамая працягваецца ў... судах і завяршаецца штрафамі дапоўнена

19.05.2017 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў




У сталічных судах 19 траўня працягнецца разгляд спраў удзельнікаў першамайскай акцыі пратэсту на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску.

У судзе Першамайскага раёна Мінска працягнецца разгляд адміністратыўнай справы па арт. 23.34 КаАП старшыні Руху «За Свабоду» **Юрася Губарэвіча**. Учора ён заявіў хадайніцтва выклікаць у суд у якасці сведкі Алеся Кіркевіча. Суддзя Сідарок задаволіла хадайніцтва і перанесла паседжанне на 19 траўня. Сёння суддзя Іна Сідарок не прыняла да ўвагі паказанні сведкі і аштрафавала Юрася Губарэвіча на 40 базавых велічынь.

У судзе Маскоўскага раёна Мінска на 10 гадзін раніцы прызначаны разгляд адміністратыўнай справы **Марыны Адамовіч**, якую таксама вінавацяць ва ўдзеле ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве, мітынгу на Кастрычніцкай плошчы 1 траўня.  Справу вядзе суддзя **Дзмітрый**

**Астапенка.** Ён выносіць пастанову аб пакаранні Адамовіч штрафам у памеры 20 базавых велічынь.

Гэты ж суд будзе разглядаць і справу сябра Руху «За Свабоду» **Аляксея Клюшнічэнкі**. Пачатак паседжання прызначаны на 11-15.

Дарэчы, 18 траўня ў судзе Маскоўскага раёна разглядалася справа актывісткі **Алены Талстой**, таксама за Першамай. Яе абвінавацілі ў парушэнні ч.3 арт.23.34 КаАП і пакаралі штрафам.

Суд Фрунзенскага раёна разглядае сёння адміністратыўную справу сябра Сойму Партыі БНФ **Андрэя Церашкова.** Актывіст прызнаны вінаватым у парушэнні артыкула 23.34 КаАП (удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве) і пакараны штрафам у памеры 10 базавых велічынь.

Нагадаем, за першамайскую акцыю ў Мінску на гэты час арыштамі і штрафамі пакараныя 10 чалавек, сярод якіх **Уладзімір Някляеў, Павел Севярынец, Максім Вінярскі, Вячаслаў Сіўчык, Леанід Кулакоў** ды іншыя ўдзельнікі мітынгу.

Усяго па інфармацыі праваабаронцаў супрацоўнікі міліцыі склалі рапарты амаль на два дзесяткі чалавек. Можна меркаваць, што судовы канвеер за Першамай яшчэ будзе працягвацца не адзін дзень.

Твитнуть











Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

## ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

"Я, напэўна, проста памру тут": хто з палітвязняў знаходзіцца ў асаблівай рызыцы за кратамі







## АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму (дапоўнена)

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

# Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023










## ПАРТНЁРСТВА

## СЯБРОЎСТВА





































E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY